


21 лютага ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Ён быў абвешчаны ЮНЕСКА па прапанове Бангладэша. Сярод 25 суаўтараў рэзалюцыі аб гэтым свяце была і Беларусь.

Самай важнай для любога чалавека з’яўляецца тая мова, на якой ён упершыню вучыцца размаўляць і пазнаваць навакольны свет. Гэта мова дзяцінства, мова, на якой размаўляюць у сям’і, мова першых узаемаадносін у грамадстве. З самага нараджэння неабходна закласці ў душу дзіцяці гэтую спадчыну — родную мову. Без мовы не існаваў бы свет. На мове мы думаем, размаўляем, робім. У Міжнародны дзень роднай мовы ўсе мовы прызнаюцца роўнымі, таму што кожная з іх унікальным чынам адпавядае прызначэнню чалавека. Кожны мае магчымасць убачыць гэты нацыянальны скарб, які трэба шанаваць, любіць, берагчы і перадаваць наступным пакаленням.

Беларуская мова – гэта наша родная мова, якая заслугоўвае нашай ўвагі і захавання. Яна мае багатую гісторыю і літаратуру, якая адлюстроўвае наш дух і характар. Яна мае свой унікальны гукавы склад і граматыку, якая робіць яе выразнай і прывабнай. Яна мае свой колер і смак, які робяць яе мілагучай і прыгожай.

Родная мова… Што можа параўняцца з яе напеўнасцю і прыгажосцю?

Напярэдадні свята ў бібліятэцы каледжа падрыхтавана выстава літаратуры “**На роднай мове**”, дзе чытачам прапануюць творы беларускіх пісьменнікаў.


Школьная бібліятэка
Васіль Быкаў
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
ВАЛЬС ПАД ЖУРАЎЛІНЫМІ ТАПОЛЯМІ
Якуб Колас
НА РОСТАНЯХ
Барыс Сачанка
ЯКУБ КОЛАС
МІХАСЁВЫ ПРЫГОДЫ
Алесь Адамович
Янка Маўр
Слёзы Тубі
На роднай мове


На роднай мове
Слёзы Тубі


ЛЬВЫ
На роднай мове
Слёзы Тубі